В заключение работы еще раз подчеркнем, что многие представители православного духовенства, в трудный час не только духовной поддержкой помогали партизанам и подпольщикам, но и оказывали действенную практическую помощь. Они воевали с оружием в руках и отдавали жизни за свободу своей Родины и своей веры. Они не могли предать свой народ и в трудный час выполняли свой пастырский долг. Проведенное исследование позволило выявить некоторые важные аспекты деятельности Русской Православной Церкви на территории Беларуси в период Великой Отечественной войны. Анализ архивных материалов, воспоминаний современников показывает, что Церковь играла значительную роль в сопротивлении немецкой оккупации, оказывая духовную поддержку населению, участвуя в патриотической пропаганде и даже содействуя партизанскому движению.

Список используемых источников:

1. Силова, С. В. Крестный путь: Белорусская Православная Церковь в период Немецкой оккупации 1941–1944 гг. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://militera.lib.ru/research/0/pdf/silova_sv01.pdf. – Дата доступа: 10.05.2025 г.
2. Шарков, А. В. Под крестом судьбы / А. В. Шарков, В. В. Грозов, Ю. А. Бествицкий. – Минск : Белорусская Православная Церковь, 2011. – 431 с.

УДК 355.01

# ВАЙНА ЯК САЦЫЯКУЛЬТУРНЫ ФЕНОМЕН ГРАМАДСТВА

**Хаданёнак Віктар Мамертавіч,**
*кандыдат гістарчыных навук,*
*дацэнт кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін,*
**Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт,**
**г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь**

*Ключавыя словы: вайна, феномен, цывілізацыя, агрэсіўнасць, канфлікты, калектыўная памяць, інфармацыйнае супрацьстаянне, рэваншызм, кіберканфлікты, таталітарызм, дэгуманізацыя.*

*Рэферат. У артыкуле разглядаюцца розныя падыходы да асэнсавання і ўспрымання вайны, як сацыякультурнага феномена. Асаблівая ўвага надаецца аналізу механізмаў ўзнікнення вайны і даюцца рэкамендацыі па яе недапушчэнні.*

У Рэспубліцы Беларусь у 2025 г. урачыста адзначылі 80-годдзе перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Дзякуючы самаахвярнаму подзвігу нашых людзей агрэсар быў пераможаны. З чэрвеня 1941 па ліпень 1944 года тэрыторыя нашай краіны была акупавана ворагам. Фашысты бязлітасна знішчалі мірнае насельніцтва, руйнавалі гарады, спальвалі вёскі… Вялікая Айчынная вайна пакінула глыбокі след у калектыўнай памяці беларусаў. Юбілей перамогі – гэта яшчэ адна магчымасць для грунтоўнага асэнсавання самой прыроды і характару вайны, яе асноўных асаблівасцяў і заканамернасцяў.

Сёння, калі свет скаланаюць лакальныя канфлікты, разуменне механізмаў, якія вядуць да разгортвання маштабнай вайны, становіцца надзвычай важным і актуальным. Вайна гэта не проста ўзброенае сутыкненне паміж дзяржавамі і народамі, не проста тактычныя і стратэгічныя аперацыі вайсковых сіл, але і надзвычай складаны і шматгранны сацыякультурны феномен.

Вучоныя і даследчыкі не маюць адназначнага падыходу да вызначэння спецыфікі вайны і фактараў, якія да яе прыводзяць. Існуе цэлы шэраг аўтарытэтных канцэпцый, якія адрозніваюцца сваім унікальным метадалагічным інструментарыем. Важна прымяняць міждысцыплінарны падыход падчас аналізу феномена вайны, каб пазбегнуць вузкаспецыяльных меркаванняў і гіпотэз. Варта абапірацца на новыя дасягненні ў гістарычнай навуцы, антрапалогіі, філасофіі, псіхалогіі, паліталогіі і іншых вобласцях спасціжэння рэчаіснасці.

Вядомы ваенны тэарэтык, военачальнік і гісторык Карл Філіп Готліб фон Клаўзевіц, у сваім грунтоўным трактаце «Аб вайне», які стаў сапраўднай класікай, вызначае вайну «… не толькі як палітычны акт, але і як сапраўдную зброю палітыкі, працяг палітычных адносін, правядзенне іх іншымі сродкамі» [1, с. 43]. Ён падкрэслівае, што вайна гэта самы дзейны і эфектыўны сродак для дасягнення сваіх палітычных мэтаў. А татальная і ўсеахопная вайна абмяжоўваецца толькі палітычнымі разлікамі, наяўнасцю дастатковай колькасці рэсурсаў і настроямі ў грамадстве. Палітычная ж задума, згодна з яго меркаваннем, з'яўляецца першапачатковым зародкам вайны. Тым не менш, прагматычны падыход К. Клаўзевіца не ўлічвае цэлы шэраг прынцыповых момантаў. Так, асабліва ў глыбокім мінулым, асобныя войны не мелі выразна акрэсленых палітычных мэтаў, а насілі рытуальны ці нават сакральны характар. XXI стагоддзе, якое мае на ўзбраенні ядзерную зброю і найноўшыя тэхналогіі, увогуле можа нівеліраваць гэтак званую палітычную рацыянальнасць.

Выбітны французскі філосаф Раймон Клод Фердынанд Арон у сваёй рабоце «Мір і вайна паміж народамі», напісанай у 1962 г., разглядае не толькі рацыянальныя прычыны і механізмы вайны. Асаблівую ўвагу ён звяртае на ірацыянальныя чыннікі, такія як страх, нянавісць і гістарычныя міфы [2, с. 112]. Як правіла, яны прыводзяць да надзвычайнай эскалацыі гвалту і неўтаймаванай жорсткасці, і даволі часта маюць перавагу над рацыянальным мысленнем і

прагматызмам. Прынамсі, страх перад стратай статуса альбо рэсурсаў часцяком штурхае дзяржавы да пачатку прэвентыўных войнаў, нават калі гэта супярэчыць рацыянальнаму разліку. А татальнае расавае вынішчэнне, санкцыянаванае А. Гітлерам, гэта не працяг палітыкі, а поўны яе правал і катастрофа [2]. Але Р. Арон у сваім падыходзе звяртае недастатковую ўвагу, альбо цалкам ігнаруе разгляд самой прыроды гвалту, ірацыянальныя паводзіны эліт як маскіроўку матэрыяльных інтарэсаў капіталістычнай сістэмы, індывідуальную псіхапаталогію і ўтрапёнасць А. Гітлера, не ўлічвае, што гістарычныя міфы з’яўляюцца канструктыўным элементам пераважнай большасці нацый, мала ўвагі надае палітычным тэхналогіям улады. За гэта Р. Арона часцяком крытыкавалі навукоўцы, ад Дж. Кігана, Э. Валерстайна і Э. Фрома да Б. Андэрсана і М. Фуко.

У іншым рэчышчы разглядае спецыфіку вайны аўтарытэтны брытанскі гісторык Джон Патрык Кіган. Ён вывучае антрапалагічныя перадумовы вайны і спрабуе прааналізаваць яе праз прызму культурных асаблівасцяў асобных этнасаў. Дж. Кіган акцэнтуе ўвагу на такіх пытаннях, як вайсковыя каштоўнасці, слава, адрозненні ў культурных парадыгмах і інш. Прыводзяцца прыклады пра адмову французскай арміі ад камуфляжа, бо гэта форма не варта Францыі [3], а рамантыка штыкавой і сабельнай атакі паказваецца як смяротная ілюзія ва ўмовах кулямётнага агню. Дж. Кіган атрымаў сваю порцыю крытыкі за тое, што занадта перабольшваў ролю культурных традыцый і перакананняў, часам ігнаруючы тэхналагічныя імператывы і эканамічныя фактары.

Доктар філасофіі, прафесар Лонданскага ўніверсітэта Эрык Хабсбаўм бачыць гісторыю ў тым ліку і як «хроніку злачынстваў і вар’яцтваў рода чалавечага» [4, с. 613]. Ваенныя канфлікты паказваюцца ім у першую чаргу праз прызму супрацьстаяння розных ідэалагічных сістэм. Эрык Хабсбаўм засяроджвае ўвагу на канфрантацыі сацыялістычнага і ліберальнага мыслення, а таксама аналізуе нацыяналізм, як мабілізуючую сілу ў войнах ХХ стагоддзя. Ён прыходзіць да высновы, што з’яўленне ядзернай зброі прывяло да таго, што новым полем бітвы сталі, кіно, навука і спорт. Асабліва непакоіць слыннага брытанскага прафесара тое, што вучоныя ў ХХ ст. аказаліся «палітызаванымі» [4, с. 572]. А ўрады краін цікавіць не навуковая, а ў першую чаргу «інструментальная ісціна», якую можна паспяхова скарыстаць для развіцця ваенна-прамысловага комплексу. Між іншым, Э. Хабсбаўма крытыкуюць за разгляд феномена вайны ў рэчышчы марксісцкай парадыгмы, залішнюю рамантызацыю сацыялістычных эксперыментаў і перабольшванне ролі класавай барацьбы.

Амерыканскі сацыёлаг і палітолаг Самуэль Хантынгтан разглядае ваенныя канфлікты як сутыкненне цывілізацый. Ён абазначае пэўныя «цывілізацыйныя разломы», якія заўжды будуць месцам павышанай небяспекі ва ўзаемадачыненнях паміж дзяржавамі. Галоўныя ўдзельнікі ваенных канфліктаў на мяжы цывілізацыйных разломаў не ў стане самастойна спыніць войны, у гэтым ім

мусяць дапамагчы гэтак званыя «стрыжнявыя краіны асноўных сусветных цывілізацый» [5, с. 492]. Будучыня нашай планеты, на яго думку, наупрост залежыць ад разумення і супрацоўніцтва паміж палітычнымі, духоўнымі і інтэлектуальнымі лідэрамі галоўных сусветных цывілізацый. Але ж у канцэпцыі С. Хантынгтана культурныя адрозненні паміж народамі залішне спрашчаюцца і зводзяцца да біялагічных катэгорый, часам ігнаруецца гібрыднасць і ўзаемадзеянне цывілізацый, не ўлічваюцца іх лакальныя асаблівасці.

Ізраільскі ваенны гісторык-медыевіст і футуролаг Юваль Ной Харары перакананы, што войны будучыні будуць весціся не за тэрыторыі, золата, нафту і рабочыя рукі, а за кантроль над плынямі інфармацыі. Калі вы валодаеце інфармацыяй, вам не патрэбныя танкі, каб падпарадкаваць народ – дастаткова ведаць яго страхі, жаданні і звычкі, лепш чым ён сам [6, с. 322–323]. Адбываецца павольны пераход ад агнявых да кіберканфліктаў і інфармацыйнага супрацьстаяння. Варта зазначыць, што асобныя даследчыкі ўспрымаюць такі падыход Ю. Харары як тэхнаўтапічную фантазію, бо аргументам ізраільскага вучонага часам бракуе грунтоўнага навуковага аналізу.

Нямецкі філосаф і палітычны тэарэтык Ханна Арэндт дэталёва аналізуе, якім чынам таталітарызм спрыяе развязванню войн. Згодна з яе меркаваннем, «… таталітарныя рухі магчымы толькі там, дзе існуюць масы, якія аказаліся выкінутымі з нармальнага сацыяльнага жыцця. І менавіта вайна, з яе мільёнамі ахвяр, бежанцаў і людзей, пазбаўленых радзімы, стварае гэтыя масы, якія гатовы прыняць любую ідэалогію» [7, с. 456–457]. Пастаянная мабілізацыя на вайну з’яўляецца не выпадковасцю, а самой сутнасцю таталітарнага рэжыма. Вайна дазваляе як ліквідаваць вонкавых ворагаў, так і апраўдвае тэрор унутры краіны. Сам мір небяспечны для таталітарызма. Вайна не проста працяг палітыкі, а спосаб руйнавання самой канцэпцыі права, што робіць магчымым панаванне «волі фюрэра над законам» [7, с. 221]. Вылучаюць некалькі слабых месцаў ў канцэпцыі Х. Арэндт. Навідавоку недаацэнка ролі эканамічных фактараў пры разборы сувязяў паміж таталітарызмам і вайной. Прынамсі нямецкі нацызм быў не проста таталітарным, а абапіраўся на фінансава моцных прамыслоўцаў, ваенных і бюракратыю. А шматлікія дыктатуры ўзнікалі і без дапамогі мас, дзякуючы элітам, войску ці знешняму фактару.

Выдатны навуковец Эрых Фром пры аналізе вайны звяртаецца да глыбіннай псіхалогіі народаў і іх лідэраў. Ён выводзіць сацыяльныя перадумовы войнаў праз паталагічныя хваробы грамадства і падпарадкаванне асобы дзяржаве пры дапамозе псіхалагічных механізмаў. Ён зазначае, што «Гісторыя войн з’яўляецца хронікай бязлітасных забойстваў і катаванняў, ахвярамі якіх станавіліся і мужчыны, і жанчыны, і дзеці» [8, с. 376]. Без правакуючых фактараў, дэструктыўная энэргія народаў проста спіць. Такімі фактарамі з’яўляецца пагроза існаванню, прага кроўнай помсты, альбо садысцкія схільнасці чалавека. Тым не менш, Э. Фром

верыў у здольнасці чалавека вызваліцца з палона ілюзій і ўмоўнасцей, якія ён сам для сябе стварыў [8, с. 601]. Гэта дазволіла б зменшыць агрэсіўнасць людзей і абмежаваць колькасць кровапралітных войнаў.

Ёган Хёйзінга паслядоўна канструюе канцэпцыю «мілітарызаванай свядомасці», якая ўрэшце рэшт прыводзіць да вайны. Ён звяртае ўвагу на то, што калі дзяржава пераўтварае культуру ў дадатак да ваеннай машыны, яна забівае саму душу цывілізацыі. Адбываецца культурная дэградацыя, сакралізацыя ваеннай тэрміналогіі, рытуалізацыя гвалту і вайсковага патрыятызму. Вайна ператвараецца ў жахлівую гульню з дакладнымі правіламі. Ё. Хёйзінга паслядоўна тлумачыць, як у грамадства выпрацоўвалась псіхалагічная гатоўнасць да пастаяннай вайны. Прынамсі «У грамадстве з абавязковай народнай адукацыяй, усеагульнай галоснасцю, і шырокім падзелам працы сярэдні індывідуум усё радзей і радзей аказваецца ва ўмовах, дзе ад яго патрабуецца ўласнае мысленне і самапраяўленне» [9, с. 87]. Як гэта ні дзіўна, менавіта адсутнасць крытычнага мыслення і з'яўляецца адной з самых небяспечных перадумоваў вайны. Для канцэптуальнага падыхода Ё. Хёйзінгі, як адзначаюць асобныя крытыкі яго работы (Т. Адарно, К. Манхейм і інш.), характэрны залішні песімізм, катастрафізм і антытэхналагізм.

Аўстрыйскі псіхолаг і псіхааналітык Зігмунд Фрэйд у сваёй вядомай рабоце «Дыскамфорт ад культуры» выводзіць схільнасць чалавека да войнаў з яго агрэсіўнасці. Ён зазначае, што «Той, хто ўспомніць пра жахі вялікага перасялення народаў, пра нашэсце гунаў і так званых манголаў на чале з Чынгісханам і Тамерланам, пра заваёву Ерусаліма пабожнымі рыцарамі крыжакамі і зусім нядаўнія жудасці апошняй сусветнай вайны, вымушаны будзе прыніжана апусціць галаў і прызнаць, што схільнасць да агрэсіўнасці існуе» [10, с. 60]. Культура ж падаўляе натуральныя агрэсіўныя імпульсы чалавека, але праз гэта ён становіцца неўротыкам. Аднак ніякая культура не можа дашчэнту выцесніць з чалавека інстынкт смерці «Танатас», які непасрэдна прыводзіць да ваенных канфліктаў. Канцэпцыя Зігмунда Фрэйда была даволі неадназначна прынята навуковай супольнасцю і шмат крытыкавалася (Э. Фром, Г. Маркузэ, К. Юнг).

Амерыканскі сацыяльны псіхолаг Філіп Зімбардо разглядае зло не як уласцівасць і прыроджаную якасць людзей, а як вынік дзеяння сістэмы, якая заахвочвае да паслядоўнай дэгуманізацыі іншых. Аналізуючы вайну ва В'етнаме і знакаміты Стэнфардскі турэмны эксперымент, ён прыходзіць да высновы, што вайна стварае аптымальныя магчымасці для праяўлення зла праз ананімнасць, дэіндывідуалізацыю і легальны дазвол на забойства [11]. Большасць людзей жа пераступае праз маральныя межы не з-за ўнутранай заганнасці, а пад ціскам аўтарытэта і канфармізма. Ваенная прапаганда працуе такім чынам, што агрэсія становіцца нормай, калі група людзей стварае вобраз іншага як «недачалавека». Філіп Зімбардо атрымаў сваю долю крытыкі за залішні маральны рэлятывізм і

імкненне зняць адказнасць непасрэдна з індывіда.

Такім чынам, праведзенае даследванне дазваляе выказаць меркаванне, што вайна ўяўляе сабой надзвычай шматгранны сацыяльна-палітычны феномен. Пры яе разглядзе варта ўлічваць як універсальныя заканамернасці, так і ірацыянальныя фактары і культурна-антрапалагічныя асаблівасці народаў і краін. Людзі мусяць імкнуцца не проста не дапускаць войнаў, але і імкнуцца да сацыяльнай справядлівасці і адсутнасці ўсялякіх формаў прыгнёту чалавека. Варта ўмацоўваць міжнародныя інстытуты і развіваць своеасаблівыя «супольнасці бяспекі», а таксама наладзіць тэхналагічны кантроль над забаронай вытворчасці зброі масавага знішчэння людзей. Неабходна паслядоўна і метадычна праводзіць дэмілітарызацыю масавай свядомасці грамадства і выкарыстоўваць іншыя механізмы пацыфікацыі. Краіны мусяць пазбавіцца рэваншызма і праяўляць пільнасць і міжнародную салідарнасць у пытаннях папярэджвання разнастайных ваенных канфліктаў. Бо інакш рэальная будучыня існавання чалавецтва акажацца пад пагрозай ужо сёння.

Спіс выкарыстаных крыніц:

1. Клаузевиц, К. О войне / К. Клаузевиц ; пер. с нем. А. К. Рачинского. – Москва : Логос, 2007. – 448 с.

2. Арон, Р. Мир и война между народами / Р. Арон. – Москва : Nota Bene, 2000. – 880 с.

3. Киган, Дж. Первая мировая война / Пер. с англ. Т. Шуликовой. – М. : АСТ, 2004. – 576 с.

4. Хобсбаум, Э. Век крайностей: Короткий двадцатый век (1914–1991) / Пер. с англ. А. Д. Смирнова; науч. ред. Б. И. Пуришев. – М. : Независимая газета, 2004. – 632 с.

5. Хантингтон, С. Столкновение цивилизаций / Пер. с англ. Т. Велимеева, Ю. Новикова. – М. : АСТ, 2005. – 603 с.

6. Харари, Ю. Н. Homo Deus: Краткая история будущего / Пер. с англ. А. Андреева. – М. : Синдбад, 2018. – 496 с.

7. Арендт, Х. Истоки тоталитаризма / Пер. с англ. И. В. Борисовой, Ю. А. Кимелева, А. Д. Ковалева. – М. : ЦентрКом, 1996. – 672 с.

8. Фромм, Э. Анатомия человеческой деструктивности / Пер. с англ. Э. М. Телятниковой. – М. : АСТ, 2006. – 635 с.

9. Хёйзинга, Й. В тени завтрашнего дня: Диагноз духовного недуга нашей эпохи / Пер. с нидерл. В. О. Шибаева. – СПб. : Изд-во Ивана Лимбаха, 2021. – 224 с.

10. Фройд, З. Дыскамфорт ад культуры / Пер. з ням. Я. Бяласіна. – Мн. : Энцыклапедыкс, 2001. – 100 с.

11. Зимбардо, Ф. Эффект Люцифера. Почему хорошие люди превращаются в злодеев / Филип Зимбардо ; Пер. с англ. – М. : Альпина нон-фикшн, 2013. – 740 с.